

«Урач прапанавала: ты прымі рашэнне, і ён будзе «за». Сапраўды, ён не спужаўся. Пасля і вырашыла нараджаць. У час ваганняў гаварылі са мной псіхолагі, фільм паказалі страшны пра аборты.

СТАР. 4



Сёлета завяршаецца праца па прыцягненні ў гаспадарчы абарот будынкаў, якія не выкарыстоўваліся. У Магілёўскай вобласці падводзяць прамежкавыя вынікі ў гэтай сферы.

СТАР. 5



Пра тое, што пасадцы дрэў вакол Любчы заўсёды надавалася вялікая ўвага, сведчаць старажытныя дакументы. Зразумела, што парк вакол Любчанскага замка застаецца каштоўным і цяпер.

СТАР. 6


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ВЕРАСНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 180 (27295) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І УЛАДЗІМІР ПУЦІН АБМЕРКАВАЛІ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ Ў ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ СТРУКТУРАХ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін 15 верасня ў Сочы разгледзелі шырокае кола пытанняў як двухбаковых адносін, так і ўзаемадзеяння ў рамках розных інтэграцыйных аб'яднанняў, абмяняліся меркаваннямі па актуальных тэмах сусветнага парадку дня.**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнты таксама абмеркавалі гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін, рэалізацыю буйных сумесных праектаў, у тым ліку будаўніцтва Беларускай АЭС. У якасці важнага пазітыўнага моманту быў адзначаны рост тавараабароту.

«Рады магчымасці пагаварыць з вамі. Спадзяюся, тут вы з задавальненнем праведзяце некалькі дзён, — сказаў Уладзімір Пуцін, адкрываючы сустрэчу. — У нас будзе магчымасць абмеркаваць нашы двухбаковыя сувязі, яны развіваюцца вельмі добра, але і пагаворым па інтэграцыйных праектах». «Тут мы фіксуем станоўчае развіццё, ва ўсіх трох краін назіраецца вельмі добрая дынаміка. Гандлёва-эканамічныя сувязі, інвестыцыйнае супрацоўніцтва расце», — адзначыў прэзідэнт Расіі.

«Што датычыцца эканомікі, вы маеце рацыю, у нас сітуацыя нармальная, і ў інтэграцыі вельмі станоўчыя працэсы ідуць, павялічваецца тавараабарот», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, ужо амаль 50 краін хацелі б заключыць з АЭП пагадненні аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. «Гэта пра многае сведчыць. Мы аб гэтым пагаворым, і аб тым, што робіцца ў АДКБ, у рамках Саюзнай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У ходзе сустрэчы Уладзімір Пуцін расказаў Аляксандру Лукашэнку аб выніках работы саміту АЦЭС. У тым ліку ён адзначыў, што ў сваіх выступленнях на саміце неаднаразова падкрэсліваў той факт, што Расія прадстаўляе не толькі свае ўласныя інтарэсы, але таксама інтарэсы ўсяго Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. «У нашых партнёраў гэта выклікае сур'ёзную цікавасць, і некаторыя краіны ўжо хацелі б заключыць з АЭП пагадненні аб зоне свабоднага гандлю. Мы фактычна завяршылі работу ў рамках рабочай групы з В'етнамам, можна было б ужо пачаць работу па гэтым напрамку», — адзначыў Уладзімір Пуцін, падкрэсліўшы, што ёсць і іншыя краіны з развітой эканомікай, якія зацікаўлены ў такім супрацоўніцтве. «Але нам трэба вельмі ўважліва ўзважыць усе за і супраць, таму што пры вырашэнні такіх пытанняў патрэбна, безумоўна, глядзець па таварных пазіцыях, таварных групах, выраўноўваць інтарэсы з абодвух бакоў, — лічыць расійскі лідар. — Але цікавасць непадробленая, шчырая. Гэта сведчыць аб прызнанні прывабнасці нашага агульнага рынку Мытнага саюза і АЭП і аб перспектывах, якія нашы партнёры бачаць ва ўзаемадзеянні з намі». У ходзе перагавораў ішла таксама размова аб тым, каб 19 снежня ў Маскве правесці саміты АДКБ, ЕўрАзЭС і Мытнага саюза.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка па запрашэнні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна правядзе кароткатэрміновы водпуск у Сочы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ «Прамая лінія»

### Усе пытанні грашова-крэдытнай палітыкі

**19 верасня 2012 года з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ.** Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны — тэлефануйце!

Задаць пытанне падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 292 38 92 і 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **info@zvyazda.minsk.by.**

## СТАЛІЦА ЛАДЗІЦЬ КІРМАШЫ



Аляксандр ЯФІМАЎ са Жлобінскага раёна з ураджаем цыбулі са свайго агарода.



Падыходзьце, выбірайце, купляйце!..



Жыхар вёскі Кажан-Гарадок Мікалай ГУРБАНОВІЧ хваліцца сваім перцам — сакавітым і рознакаляровым.

**У мінулую суботу ў сталіцу прыйшла кірмашовая восень. Шумная, вясёлая, заклапочаная: адны хочуць купіць, другім трэба прадаць. На гарадскіх плошчах пачаўся продаж сельспрадукцыі з фермерскіх і вясковых падвор'яў, сельскіх кааператываў і каапсаюзаў. Садавіна і гародніна, мёд, рыба, мясныя вырабы, кандытарскія... Выбар багаты. А калі дадаць да гэтага канцэртныя пляцоўкі з «жывымі» артыстамі, гарачую юшку і шашлыкі з півам... Сапраўднае свята.**

Сказаць, што сталічны народ літаральна змятаў з прылаўкаў прывезены з палёў ураджай, дык такога не назіралася. Адчувалася, што наведнікі гэтых першых кірмашоў прыцэньваліся. Нават бульбу рэдка хто купляў цэлым мехам. Маўляў, кірмашовая восень яшчэ наперадзе, пасочым крыху за коштамі...

Гэтыя здымкі зроблены на кірмашы ў сталічным мікрараёне Уручча. Традыцыйна сюды з'язджаюцца адны і тыя ж гандляры садавіной і гароднінай з уласных падвор'яў. Добра ведаюць і нават чакаюць тут Аляксандра Яфімава са Жлобінскага раёна, хоць ён толькі другі год займаецца агародніцкай справай. Пытаюцца, ці хутка прыедзе зноў. На ягоным прылаўку заўсёдныя цыбуля, капуста, бульба і морква, розныя гатункі таматаў. Нават і не скажаш, што сёлетні ўраджай не надта парадаваў гаспадара — лета было засушлівым.

Памідорамі, перцам, кабачкамі прывабліваў да свайго куточка гаспадар з Кажан-Гарадка Лунінецкага раёна Мікалай Гурбановіч. За 250 кіламетраў прыехаў у сталіцу. Гаспадыні ахвотна куплялі ў яго зялёныя пучкі пятрушкі і кмену.

Добрай капустай гандлявалі вытворцы з вядомых на ўсю Беларусь і далёка за яе межамі Альшан на Століншчыне. У гэтую пару ў іх яшчэ не пераводзяцца нават агуркі.

Восеньскія кірмашы будуць ладзіцца цяпер штосуботу, працаваць да 17 гадзін.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД, кіраўнік місіі наглядальнікаў ад СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ:**

«Заклікі да байкоту выбараў з'яўляюцца дэструктыўнай пазіцыяй асобных грамадзян і палітыкаў. У шэрагу заходніх дзяржаў, у прыватнасці, у Грэцыі, Бельгіі, ухіленне ад галасавання забаронена законам. Калі, напрыклад, грамадзянін не пайшоў галасаваць, то за гэта ён прыцягваецца да адказнасці — ад штрафу да крымінальнага пакарання. І гэта чамусьці там успрымаецца нармальна. Калі разглядаць выбарчае заканадаўства з гэтага пункту гледжання, то на постсавецкай прасторы яно нават больш ліберальнае — у ім няма нормы, якая абавязвала б грамадзяніна абавязкова ісці на выбарчы ўчастак».

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 21° |
| Віцебск | + 16° |
| Гомель | + 18° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 17° |
| Мінск | + 18° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.09.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8380,00 | ▼ |
| Еўра | 10990,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1031,96 | ▼ |

■ Энергетычная бяспека

## «ЭКАНОМНЫ» ДОМ ВУЛІЦУ НЕ ГРЭЕ

### Трэба імкнуцца да таго, каб кожны квадратны метр жылля быў энергаэфектыўным

**Вось ужо некалькі гадоў запар мясцовыя газеты ў Гродне друкуюць спіс аб'ектаў капітальнага рамонту жыллёвага фонду, у тым ліку і тыя, якія будуць уцяпляцца за кошт бюджэтных сродкаў. І цяпер у розных мікрараёнах абласнога цэнтра можна ўбачыць, як гэта робіцца. Прычым дом становіцца не толькі вельмі «эканомным», але і больш прыгожым. Сёлета ў спісе «шчаслівчыкаў», якія дачакаліся так званай тэрмашубы, каля 40 шматпавярховак — у асноўным пабудовы 1960-1980-х гадоў. Быццам і нямала, але гэта мізэрна ў параўнанні з рэальнымі маштабамі праблемы.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле разлікаў **галоўнага інжынера інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Рышарда КАЦЫНЕЛЯ**, толькі ў абласным цэнтры цеплаахова старых дамоў дасць эканомію энергіі, якая перавышае сярэднегадавую магутнасць Гродзенскай ГЭС — пры тых жа выдатках і адсутнасці бягучых затрат па эксплуатацыі.

— Маштабы гэтай праблемы мы ўбачылі, калі з дапамогай цеплавізара выявілі сітуацыю са стратамі цяпла ў жылых дамах, пабудаваных за апошнія 50 гадоў. Вынік шакіраваў: цепластраты праз сцены ў старых цагляных будынках у чатыры разы большыя ў параўнанні з дамамі, пабудаванымі па нормах 2011 года. А панэльныя дамы 116-й серыі страчваюць яшчэ больш.

Рышард Кацынель прапануе параўнаць два жылыя дамы ў Гродне, якія з дапамогай цеплавізара былі даследаваны на прадмет страт цяпла пры тэмпературы на вуліцы мінус 12 градусаў:

— Ва ўцепленым доме сярэдняя тэмпература на вонкавай паверхні сцяны склала мінус 9,3 градуса, што блізка да нормы. А вось у другім, панэльным доме, дзе награвальныя прыборы (рэгістры) забетанаваны ў сценах — усяго мінус 3 градусы. Гэта значыць, што другі дом, па сутнасці, грэе вуліцу: страты цяпла праз яго сцены ў 4 разы большыя ў параўнанні з уцепленым будынкам.

Атрымліваецца, што за ацяпляльны сезон праз адзін квадратны метр сцяны страчваецца 200 кілават-гадзін, альбо 0,17 Гкал энергіі. У маштабах горада, вобласці, рэспублікі гэта выліваецца нават не ў ручаі, а ў рэкі энергарэсурсаў.

СТАР. 3

## ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ НА АДПАЧЫНКУ НЕ БЫВАЕ

**Супрацоўнік Рагачоўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Сяргей Канцавы прыехаў у Гомель, каб сустрэцца са сваёй дзяўчынай, студэнткай 6 курса медыцынскага ўніверсітэта.**

Маладыя людзі гулялі вакол возера ў мікрараёне «Гомсельмаш», калі пачулі з вады крык аб дапамозе. Акрамя выратавальніка, у ваду з іншага берага кінуўся і другі мужчына. Аднак спробы былі няўдалымі, і пад ваду яны сталі спускацца разам. 24-гадовы выратавальнік з дапамогай прафесійных прыёмаў выцягнуў таго, хто тануў, а другі выплыў самастойна. Пакуль Сяргей аказваў на вадзе дапамогу 50-гадоваму мужчыну, дзяўчына выклікала «хуткую дапамогу». Дарэчы, разам з медыкамі прыехала міліцыя. Праваахоўнікі ўстанавілі, што тапелец — раней неаднаразова судзімы непрацуючы мужчына.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЧЭШСКІЯ СМІ НАЗВАЛІ ПОЛЬШЧУ КРЫНІЦАЙ МЕТАНОЛАВАГА АТРУЧВАННЯ



Крыніцай масавага метанолавага атручвання ў Чэхіі, магчыма, была суседняя Польшча. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле, які апублікавала найстарэйшае чэшскае штодзённае выданне Lidove Noviny. Па звестках газеты, адна з асноўных версій следства зводзіцца да таго, што прычынай атручвання была польская вадкасць для мыцця шкла, якой зламыснікі разводзілі кантрафактны алкаголь. Адначасова чэшскі інфармацыйны партал Novinky.cz згадаў шлюбную пару, якая патрапіла з атручваннем у бальніцу горада Опава. Магчыма, пацярпелыя купілі няякасную гарэлку на рынку ў Польшчы, аднак дакладных звестак на гэты конт няма. Яшчэ адно чэшскае СМІ Idnes.cz адзначае, што большасць атручванняў прыпала на Маравію — раён Чэхіі, размешчаны непадалёк ад мяжы з Польшчай. Польская паліцыя назвала версіі чэшскіх СМІ «чуткамі».

### У ЛАТВІІ АДКРЫЛІ ПЕРШЫ Ў ПРЫБАЛТЫЦЫ МЕМАРЫЯЛ «АБАРОНЦАМ АД САВЕЦКІХ АКУПАНТАЎ»

У маленькім латвійскім горадзе Баўска адкрылі мемарыял тром карным батальёнам Waffen SS — каб было дзе ўшаноўваць дзядоў, патлумачыў ініцыятыву віцэ-мэр горада Эгіл Хелманіс. Помнік «Абаронцам Баўскі супраць другой савецкай акупацыі» стаў адзіным у Прыбалтыцы манументам, які ўшаноўвае нацысцкіх паліцаяў. Актывісты-антыфашысты ўпэўнены, што цяпер ураду прыйдзецца асудзіць дзеянні нацыстаў, а ўладам горада лепш адразу сысці ў адстаўку.

### РАЗВОД БАЦЬКОЎ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ІНСУЛЬТУ Ў СЫНОЎ

Мужчыны, чые бацькі развяліся, значна часцей сутыкаюцца з інсультамі, чым мужчыны з поўных сем'яў, заяўляюць навукоўцы з Універсітэта Таронта. Па статыстыцы дарослыя мужчыны перажывалі інсульт у тры разы часцей, калі развод бацькоў прыпадаў на той час, калі сынам не было 18 гадоў, піша The Daily Mail. Для жанчын падобная ўзаемасувязь не была актуальнай (у жанчын з разведзеных і поўных сем'яў паказчыкі інсультаў аказаліся прыкладна на адным узроўні).

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗША РЫХТУЮЦЦА ДА «АРАБСКАЙ ЗІМЫ»

**У адказ на хвалю антыамерыканскіх выступаў, якая пракацілася па амаль двух дзясятках краін з-за скандальнага фільма «Бязвіннасць мусульман», ЗША збіраюцца ўзмацніць свае замежныя прадстаўніцтвы з дапамогай вайскоўцаў. Ці зможа гэты захад абараніць амерыканскіх дыпламатаў ад новых нападаў абражаных мусульман, яшчэ трэба даведацца. Таксама няясна, ці дапаможа адпраўка воінскага кантынгенту пазбавіць амерыканскага прэзідэнта напярэдадні выбараў ад параўнанняў з папярэднікам, які не здолеў пераабрацца з-за сваёй «мяккасці».**



Кіраўнік Пентагона Леон Панета ў размове з выданнем Foreign Policy прызнаўся, што цяпер разглядаецца магчымасць адпраўкі вайскоўцаў на тэрыторыю шэрагу дзяржаў, дзе магчымыя новыя ўспышкі антыамерыканскіх выступленняў. Гаворка, па словах Панеты, можа ісці пра 17-18 краін, якія цяпер «у найбольшай ступені знаходзяцца ў зоне ўвагі».

Арабскія хваляванні, якія ўспыхнулі ўсяго за два месяцы да выбараў прэзідэнта ЗША, могуць сур'ёзна нашкодзіць Бараку Абаме, які прэтэндуе на перавыбранне. Рэспубліканцы атрымалі падставу крытыкаваць знешнюю палітыку цяперашняй амерыканскай адміністрацыі і вінаваціць прэзідэнта ў нерашучасці. Антыамерыканскія выступленні сталі найбольш сур'ёзным выпрабаваннем для знешняй палітыкі Абамы ў гэтым перадвыбарным сезоне, піша New York Times.

### НАДВОР'Е

У аўторак тэрыторыя нашай краіны застанецца ў зоне павышанага ціску, таму будзе сонечна і цёпла, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА**.

Максімальная тэмпература паветра будзе вагацца ад 17 цяпла па паўночным усходзе да плюс 24 градусаў па паўднёвым захадзе Беларусі. А вось 19 верасня атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе да нас кароткачасовыя дажджы, пераважна па паўночным захадзе краіны. Тэмпература паветра ўначы на сераду 5—12, па паўночным захадзе — да плюс 14, удзень — плюс 17—24, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 26 градусаў.

У чацвер сур'ёзныя дажджы будуць ісці ўжо паўсюдна, **месцамі чакаюцца нават моцныя ліўні,** часам навальніцы. Пахаладае. Тэмпература на працягу сутак не больш за 9—16 цяпла, толькі на ўсходзе краіны яшчэ да 17—23 градусаў. У пятніцу дажджы чакаюцца толькі на ўсходзе Беларусі, а ўначы стане халадней. Прагназуецца, што ўначы на пятніцу будзе толькі 3—10, удзень — 10—16 цяпла, а на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці да плюс 18 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЯК ЧАСТА ВЫ НАБЫВАЕЦЕ ТАВАРЫ Ў КРЭДЫТ?



**Ала ЛІПСКАЯ, цырульнік, в. Глінка Столінскага раёна:**

— Былі выпадкі, калі набывала тавары такім чынам. Напэўна, кожны знойдзе тут для сябе плюсы і мінусы. Калі купляеш нейкі тавар у крэдыт у краме, то сума, якую пераплачваеш, не надта вялікая. І тады ў гэтым ёсць пэўная выгада, бо працэнт невялікі. А вось, напрыклад, мы бралі валютны крэдыт на пакупку дома, дык пераплата была каласальная. Асабліва пасля павышэння курсу долара гэта адбівалася на заработнай плаце. На маю думку, увязвацца ў маштабныя крэдыты досыць рызыкоўна. Мы гэта адчулі на сабе.



**Таццяна ПІЛІПЧУК, менеджар кампаніі «Арыфлэйм», г. Кобрын:**

— Сёння набыць тавар у крэдыт вельмі проста. Але ці варта? Многія з нас маюць машыну, кватэру, бытавую тэхніку, купленыя ў крэдыт. Ёсць людзі, якія зарабляюць штомесяц 1 мільён рублёў, а па крэдытах выплачваюць 1,5 мільёна рублёў. Сітуацыя відавочная. Такія людзі вымушаны перакрэдытоўвацца амаль кожны месяц у розных банках. Пытанне — навошта? Навокал так шмат спакус, рэкламы: «крэдыты на льготных умовах за 5 хвілін», «не шкадуй нічога для сябе» і г. д. Я лічу, калі нейкая мадэль тэлевізара вам не па кішэні, то не варта яе купляць. Не хочаце адмаўляцца ад мары, дык зарабіце на гэта. Адзінае «за» я магу сказаць на карысць крэдытавання жылля. Лепш плаціць крэдыт і мець свой кут, чым кожны месяц плаціць арэнду.



**Вікторыя БАЖЫНА, менеджар па арганізацыі грузаперавозак ТАА «Велес Трак», г. Мінск:**

— Я лічу, што ў нашай краіне набываць тавары ў крэдыт абсалютна не выгадна. Бо вельмі высокія працэнтныя стаўкі. Часам даводзіцца пераплачваць каля 50 працэнтаў ад першапачатковага кошту. Згадзіцеся, нямала! Але калі скарыстацца крэдытам, каб распачаць уласны бізнэс, то гэта варыянт. Пры ўмове, што ў далейшым вашы даходы будуць пакрываць не толькі выдаткі на выплаты па крэдыце, але і прыносіць вам дывідэнды.

**Падрыхтавала Алена ДРАПКО.**

# ВІНШАВАННІ ПРЭЗІДЭНТА

### Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Нурсултана Назарбаева з 20-годдзем устанаўлення дыпадносін паміж Беларуссю і Казахстанам

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Казахстан Нурсултана Назарбаева і народ гэтай краіны з 20-годдзем з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Казахстанам.

«За мінулыя два дзесяцігоддзі нашы краіны прайшлі няпросты шлях станаўлення і развіцця дзяржаўнасці, умацавання суверэнітэту і незалежнасці, забеспячэння дастойнага жыцця сваіх грамадзян, — гаворыцца ў віншаванні. — І сёння Беларусь і Казахстан — стратэгічныя партнёры і саюзнікі. Актыўнае двухбаковае супрацоўніцтва мае сістэмны характар, паспяхова пашыраецца ўзаемадзеянне па ўсіх напрамках».

«Імкненне нашых народаў да дружбы і яднання, якое склалася гістарычна, дало магчымасць пачаць працэсы глыбокай інтэграцыі ў рамках Мытнага саюза і Еўразійскай эканамічнай прасторы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Перакананы, што, захоўваючы нацэленасць на ўмацаванне ўзаемнай павагі, дружбы і стратэгічнага партнёрства, мы і ў далейшым зможам забяспечыць інтэнсіўнае і ўстойлівае развіццё нашых дзяржаў, значны рост дабрабыту грамадзян», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

### Аляксандр Лукашэнка разлічвае на ўмацаванне супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Мексікай

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Мексіканскіх Злучаных Штатаў Феліпэ дэ Хесуса Кальдэрона Інахосу і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці. «Спадзяюся на далейшае развіццё канструктыўнага міждзяржаўнага дыялога, пашырэнне ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях і больш якаснае выкарыстанне магчымасцяў умацавання двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай і іншых сферах», — гаворыцца ў віншаванні.

### Аляксандр Лукашэнка павіншаваў трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў трохразовага алімпійскага чэмпіёна, заслужанага майстра спорту СССР, заслужанага трэнера БССР і СССР Аляксандра Мядзведзя з 75-годдзем. «Вы з'яўляецеся гордасцю нашай краіны, прыкладам сілы духу і фізічнай дасканаласці, спартыўнай мужнасці і непахіснага імкнення да перамогі», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы пажадаў Аляксандру Мядзведзю моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, шчасця і дабрабыту.

### Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнку

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнку з 75-годдзем. «Вы — адзін з заснавальнікаў сучаснай школы тэатральнай рэжысуры. У многім дзякуючы Вам аб беларускім драматычным тэатры XX стагоддзя як аб неардынарнай мастацкай з'яве загаварылі ў свеце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Сёння Вы прадаўжаеце натхнёна і плённа служыць любімай справе. Кожная прэм'ера, адзначаная знакам Вашага таленту, становіцца незабыўнай падзеяй. Упэўнены, што Вы і ў далейшым будзеце радаваць нас сваімі новымі пастаноўкамі, узбагачаючы скарбніцу нацыянальнай культуры», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Барысу Луцэнку моцнага здароўя, новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Уладзімір Макей абмеркаваў ключавыя пытанні беларуска-амерыканскіх адносін

Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей 17 верасня прыняў часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі Ітана Голдрыча па яго просьбе, паведамілі БЕЛТА ў МЗС Беларусі. У ходзе сустрэчы Уладзімір Макей выказаў глыбокія спачуванні амерыканскаму боку ў сувязі з трагічнай гібеллю пасла ЗША і супрацоўнікаў дыппрадстаўніцтва гэтай краіны ў Лівіі. У рамках праведзенага абмену думкамі бакі абмеркавалі ключавыя пытанні беларуска-амерыканскіх адносін.

## Дэфіцыт месцаў у студэнцкіх інтэрнатах у Беларусі будзе ліквідаваны ў 2015 годзе

Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада. Цяпер вядзецца будаўніцтва ўнікальнага для краіны аб'екта — Студэнцкай вёскі. Ужо больш за 3 тыс. студэнтаў жывуць у сучасных камфартабельных інтэрнатах. У 2012 годзе будуць уведзены ў эксплуатацыю яшчэ два інтэрнаты на 2 тыс. месцаў. Астатнія тры інтэрнаты (на 3,7 тыс. месцаў) пабудуюць у 2013 годзе. Але не толькі для студэнтаў сталічных ВНУ ствараюцца ўмовы для пражывання. Так, у гэтым годзе ў новы інтэрнат засяліліся студэнты Брэсцкага дзяржуніверсітэта. Усяго да 2016 года плануецца пабудаваць 21 інтэрнат на 11,2 тыс. месцаў.

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК МОЖА СТАЦЬ МЕГАРЭГУЛЯТАРАМ НА ФІНАНСАВЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ

**ПРА гэта заявіў учора Сяргей Дубкоў, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка, паведамляючы, што адпаведная прапанова ўжо адпраўлена ў Савет Міністраў.**

### Мэта не ў рэгуляванні, а ў развіцці

«У нашай краіне фінансавы рынак амаль не развіты, — сцвярджае Сяргей Дубкоў. — Таму прапанову аб наданні Нацыянальнаму банку пэўных паўнамоцтваў у рэгуляванні фінансавага рынку мы ўжо прадставілі ўраду краіны. У Расійскай Федэрацыі цяпер таксама разглядаецца пытанне аб наданні Цэнтральнаму банку статусу мегарэгулятара на ўсім фінансавым рынку. Гэта ўсё неабходна для таго, каб супрацьстаяць фінансаваму махлярству. Наша краіна адна з першых прыняла дзейсныя захады, якія абмяжоўвалі дзейнасць новай «МММ». Гэта дазволіла пазбегнуць істотных фінансавых страт для грамадзян краіны. Гэты прыклад паказаў неабходнасць дадатковага рэгулявання ўсіх сегментаў фінансавага рынку». Прадстаўнік Нацбанка таксама падкрэсліў, што цяпер ідзе праца і над унясеннем адпаведных змяненняў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь: «Будзе жорсткае крымінальнае пераследаванне за арганізацыю фінансавых пірамід — штраф або зняволенне на тэрмін да 5 гадоў і іншыя. Будуць уносіцца змяненні ў закон аб рэкламе. Пад рэгуляванне трапяць, напрыклад, рынак Forex і факторынг (паслугі для вытворцаў і пастаўшчыкоў, якія вядуць гандаль на ўмовах адтэрміноўкі плацяжу. — **Аўт.**)». Пра тэрміны новаўвядзенняў пакуль нічога не вядома. Дарэчы, тое самае адбылося ў многіх краінах у апошнія некалькі гадоў: «Гэта сусветны трэнд. Таму мэта не ў рэгуляванні, а ў развіцці», — упэўнены Сяргей Дубкоў.

### Сёлета аб'ём укладаў значна вырас

Па афіцыйных звестках Нацбанка, на 1 студзеня 2012 года ўклады насельніцтва складалі 49,02 трлн беларускіх рублёў (у нацыянальнай валюце — 13,85 трлн (28,3%), у замежнай — 35,17 трлн). З пачатку 2012 года аб'ём укладаў фізічных асоб павялічыўся на 20,91 трлн рублёў (42,7%). На 8 верасня гэтая лічба дасягнула 69,93 трлн рублёў (у нацыянальнай валюце — 23,18 трлн (33,15%), у замежнай — 46,75 трлн). Атрымліваецца, што з пачатку 2012 года дэпазіты ў нацыянальнай валюце павялічыліся на 67,3% (9,33 трлн), у замежнай — толькі на 32,9%. Сяргей Дубкоў тлумачыць рост рублёвых дэпазітаў іх выключнай выгаднасцю і прыбытковасцю: «На 1 студзеня 2012 года курс долара складаў 8350. Цяпер курс — 8400. Прырост усяго 50 рублёў (0,6%). А сярэдняя працэнтная стаўка па рублёвых дэпазітах — 39,4%. Значыць, даходнасць у беларускіх рублях адносна долара ЗША складае каля 39%. А ўсе рухі на рынку дэпазітаў — гэта эмоцыі, якія засноўваюцца на пэўным гістарычным вопыце. Мяркую, што чарговыя хваляванні сярод народа могуць узнікнуць напрыканцы гэтага года».

### Больш за ўсё крэдытаў — на жыллё

Аб'ём крэдытнай запазычанасці фізічных асоб за 2012 год павялічыўся на 3,82 трлн рублёў (11,9%) і на 1 верасня склаў 34,4 трлн. Пры гэтым запазычанасць на фінансаванне нерухомасці на агульных падставах за 8 месяцаў павялічылася на 4 трлн (17%) і склала 27,49 трлн рублёў. Удзельная вага крэдытаў на фінансаванне нерухомасці ў агульным аб'ёме крэдытнай запазычанасці на 1 верасня складае 76,8%, а на спажывецкія мэты — толькі 23,2%.

### Чаму крэдытаатрымальнікам пачалі прыходзіць паведамленні аб змяненні працэнтных ставак па крэдытах?

«Банкі разумеюць, што па новых крэдытах, якія яны будуць выдаваць, пасля новай рэдакцыі банкаўскага кодэкса, даходнасць будзе забяспечвацца толькі за кошт працэнтаў — камісія забаронена, — адказвае Сяргей Дубкоў. — А весці два розныя віды крэдытаў, умоўна камісійны і безкамісійны, складана. Згодна з заканадаўствам, банкі не абавязаны пераглядаць крэдытныя пагадненні. Але аперацыйныя расходы на вядзенне дзвюх баз будуць занадта вялікімі. Вось яны і імкнуцца ўніфікаваць свае крэдытныя партфелі. А крэдытаатрымальніку трэба добра падлічыць: павелічэнне працэнтных ставак пры ліквідацыі камісіі можа пакінуць тую ж суму для выплаты, што і раней. Знікненне камісій зробіць рынак больш празрыстым. Цяпер банкі не змогуць нічога «хаваць» унутры дакумента. Форма крэдытнага дагавора будзе ўніфікавана».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# КОЛЬКАСЦЬ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ ДА 294

**Пра гэта паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына на сустрэчы з прадстаўнікамі дыпламатычных місій, перадае БЕЛТА.**

«Колькасць зменшылася. На гэты час мы можам гаварыць, што ў нас 294 кандыдаты», — сказала кіраўнік ЦВК. Яна нагадала, што гэта адбылося з-за зняцця з выбараў больш як 60 кандыдатаў ад дзвюх партый, а таксама з-за індывідуальных зняццяў. Прычыны выхаду з передвыбарнай гонкі апошніх невядомы, паколькі яны не патрацілі сродкі, выдзеленыя ім з бюджэту на выбарчую кампанію. У такіх выпадках выбаркам не патрабуе тлумачыць, чаму кандыдатуры адкліканы.

Каментуючы добраахвотнае выбыццё кандыдатаў з передвыбарнай гонкі журналістам, Лідзія Ярмошына адзначыла: «У нас павялічылася колькасць безальтэрнатыўных выбарчых акруг, што дрэнна». Пасля рэгістрацыі і разгляду скаргаў Цэнтрвыбаркамам і Вярхоўным судом такіх акруг было дзве, а цяпер — не менш за дзесяць.

Больш за тое, зняцце кандыдатаў выклікае такія тэхнічныя моманты, як змяненне бюлетэняў: у кожным з іх трэба ўручную напісаць «выбыў». Партрэты кандыдатаў, што выбылі, на інфармацыйных плакатах будуць заклеены. «Усё гэта, вядома, не ўпрыгожвае выбары, выглядае жалобна, калі заклейваецца чыясьці фатаграфія», — сказала кіраўнік ЦВК.

Прамежкавая справаздача БДІПЧ АБСЕ аб назіранні за выбарамі ў Беларусі мае цалкам пазітыўны характар. Такое меркаванне Лідзія Ярмошына выказала ў размове з БЕЛТА. «Даклад цалкам пазітыўны. Прынамсі, тыя недахопы, якія адзначае АБСЕ, маюць спрэчны характар», — сказала старшыня ЦВК, прывёўшы ў якасці прыкладу заўвагу наконт таго, што кандыдатам у дэпутаты, якія заклікаюць да байкоту, было адмоўлена ў эфірным часе і друкаванай плошчы большасцю СМІ.

Рашэнне ЦВК у гэтым выпадку было абгрунтаваным, калі ён спыніў распаўсюджванне за дзяржаўны кошт заклікаў да байкоту выбараў. «Ва ўсім свеце змагаюцца з абыякавасцю выбаршчыка. Агітацыя за байкот выбараў супярэчыць самой мэце выбараў», — падкрэсліла кіраўнік ЦВК. «Даклад цалкам аб'ектыўны, не змяшчае відавочных памылак, калі няправільна абазначаецца заканадаўства наогул. Асноўныя ж ацэнкі будуць дадзены па выніках выбараў», — рэзюмавала Лідзія Ярмошына.

# ПАМЯЦІ ВАЛЯНЦІНА ЛУКШЫ

## І сотні вёрст, і сотні дзён...



Свет уладкаваны так, што з жыцця зямнога наш шлях пракладзены ў нейкую іншую, пры самім жыцці невядомую прастору. У яе перабіраюцца ўсе, незалежна ад свайго сацыяльнага ці грамадскага статусу. Вось і паэт Валянцін Антонавіч Лукша выбраўся ў тую дарогу, што ўжо будзе бясконцай, вечнай. Паэт-рамантык, аўтар тэкстаў многіх песень, задорны камсамольскі публіцыст, журналіст-чырваназменавец, ён доўгія гады натхнёна працаваў у дзіцячай літаратуры. Яшчэ зусім нядаўна «Літаратура і Мастацтва» выдала зборнік яго вершаў, казак «Дзень-залацень». Цікавыя, займальныя творы — сведчанне таго, што Валянцін Антонавіч ведаў псіхалогію дзіцячага чытача, умеў размаўляць з хлопчыкамі і дзяўчынкамі на іх мове.

А яшчэ вартым падзякі з'яўляецца і след Валянціна Лукшы як кнігавыдаўца, шматгадовага дырэктара выдавецтва «Юнацтва». Менавіта ў часы яго кіраўніцтва новыя абсягі набыла сама беларуская дзіцячая кніга. Шматаблічна, ярка выявілі сябе кніжныя мастакі. «Юнацтву» яны абавязаны школай, выдатнай практыкай. Менавіта ў тыя 1980-ыя гады выходзіла і шмат кніг беларускіх аўтараў на розных мовах свету. «Юнацтва» тым самым прапагандавала беларускую дзіцячую літаратуру. І таксама спрыяла развіццю школы мастацкага перакладу — з беларускай на іншыя мовы і з іншых моў на беларускую. Дзякуючы апантанасці Валянціна Антонавіча быў рэалізаваны няпросты праект выдання цэлай бібліятэкі дзіцячай літаратуры народаў СССР. І за гэтую працу паэт і некаторыя яго калегі былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

Успамінаючы сёння зробленае Валянцінам Лукшам, першнаперш у свядомасці ажываюць радкі: «Стаяць на рэйдзе нашы брыганціны, / Стаяць і морам трызняць каравелы. / І сотні вёрст, і сотні дзён/ прайсці нам,/ Калі яны падымуць крылы белыя...» Верш «Брыганціны» стаў песняй дзякуючы Ігару Лучанку. І многім беларусам словы гэтыя чутны праз вымаўленне Віктарам Вуячычам, якога таксама ўжо няма з намі. «І сто вятроў са ста дарог крычала,/ І клікала далёкая дарога...» Бывайце, Валянцін Антонавіч!.. Развітваемся з вамі, пакідаючы ў памяці ваш рамантычны вобраз брыганцін і каравел...

**Звяздоўцы.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 22 октября 2012 года торгов по продаже имущества, на которое обращается взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней.

| | ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА № 1 | ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | **Двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание общей площадью 378,2 кв.м (инв. № 200/С-60413)** | **Сооружение специализированное складов, хранилищ (стройдвор) с составными частями и принадлежностями: подкрановый путь; ограждение; ворота № 1; ворота № 2; емкость для хранения цемента № 2; площадь площадки 3459,0 кв.м (инв. № 200/С-60416)** |
| **Сведения о земельном участке** | Здание расположено на земельном участке 240100000001009096 | Сооружение расположено на земельном участке 240100000001009096 |
| **Местонахождение имущества** | Витебская обл. г. Витебск, ул. Полярная, 2 | Витебская обл. г. Витебск, ул. Полярная, 2 |
| **Начальная цена** | 732 295 000 рублей | 1 828 650 000 рублей |
| **Сумма задатка** | 73 229 500 рублей | 182 865 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, ком. 10, 220030, г. Минск | |
| **Балансодержатель (должник)** | ОАО «Трест Белстромремонт», г. Минск, ул. Янки Мавра, д. 51 | |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем торгов. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **22 октября 2012 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 18.09.2012 по 18.10.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 327 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

# У «БЕЛАВІЯ» З'ЯВІЎСЯ НОВЫ САМАЛЁТ — З БРАЗІЛІІ

**АВІЯКАМПАНІЯ «Белавія» паказала журналістам новы пасажырскі самалёт сярэдняй далёкасці «Эмбраер-175», які папоўніў флот авіякампаніі. Гэта першы самалёт, які паступіў у распараджэнне «Белавія» непасрэдна з завода-вытворцы і быў зроблены адмыслова на заказ беларускай авіякампаніі.**



— Як лётчык я вам скажу — гэта суперсамалёт, — падзяліўся сваім уражаннем **дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь Вадзім МЕЛЬНІК.** — Хай не крыўдзяцца на мяне іншыя вытворцы, але бразільцы сумесна з французамі стварылі самалёт, які па аэрадынамічных якасцях вельмі нядрэнна выглядае — ён вельмі эканамічны, бо калі добрая аэрадынаміка, то меншы расход паліва, а значыць — ён патрабуе менш грошай.

**Намеснік гендырэктара «Белавія» Ігар ЧАРГІНЕЦ** патлумачыў журналістам, чаму выбар быў спынены менавіта на самалёце гэтай фірмы, бо да гэтага ў «Белавія» былі толькі «Боінгі», «CRJ» і «ТУ-154»:

— Пры выбары мы перш за ўсё глядзелі на размернасць самалёта, яго надзейнасць, на камфортнасць і эканамічныя паказчыкі. Але гэта не значыць, што мы адмаўляемся ад «Боінгаў», «CRJ» — кожны з гэтых тыпаў самалётаў адпавядае свайму сегменту. Некаторы час у флоце будуць і «ТУ-154».

**Генеральны дырэктар РУП «Нацыянальная авіякампанія «Белавія» Анатоль ГУСАРАЎ** таксама расказаў журналістам, што ў кастрычніку чакаецца пастаўка яшчэ аднаго «Эмбраера-175», а ў бліжэйшы час авіякампанія плануе папоўніць свой флот да 5-6 самалётаў гэтай бразільскай фірмы:

— Мы будзем набываць як новыя самалёты з завода-вытворцы, але не будзем адмаўляцца ад лізінгавых схем па самалётах з другаснага рынку. Будзем выкарыстоўваць камбінацыі розных рашэнняў, як гэта робяць усе авіякампаніі свету.

Дарэчы, што тычыцца канкрэтна гэтага самалёта, то яго прыкладны кошт — каля 40 мільёнаў долараў. Паколькі такая сума — вельмі вялікая для авіякампаніі, ён набыты на ўмовах аператыўнага лізінгу ў амерыканскай кампаніі Air Lease Corporation (ALC). Мяркуецца, што «Эмбраер-175» будзе выкарыстоўвацца на рэгулярных рэйсах практычна па ўсіх напрамках, асабліва на тых, дзе ўжо сфарміраваны бізнэс-паток пасажыраў (бо салон выкананы ў двухкласнай кампаноўцы — 12 месцаў бізнэс-класа і 64 месцы эканом-класа) — Баку, Лондан, Масква, Парыж, Прага, Рым, Санкт-Пецярбург і г. д. Куды адправіцца новы самалёт у першы рэйс, у «Белавія» пакуль не ведаюць, але, па словах Анатоля Гусарава, хутчэй за ўсё гэта будзе Берлін.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# Кадравыя перастаноўкі ў «Цмокі-Мінск»

**Баскетбольны клуб «Мінск-2006» змяняе свой фірмовы стыль. Пачынаючы з сезона 2012-2013 года, прафесійныя каманды спартсменаў будуць выступаць пад афіцыйнай назвай «Цмокі-Мінск». Пра гэта расказаў Аляксандр Куль, дырэктар цэнтра эканамічнага развіцця і спартыўнага маркетынгу.**

Сярод шматлікіх азначэнняў «цмок» у беларускім фальклоры лічыцца ўвасабленнем багацця як матэрыяльнага, так і інтэлектуальнага і духоўнага. Але каб атрымаць яго, неабходна працаваць і імкнуцца дасягаць сваіх мэтаў.

Тры каманды баскетбольнага клуба ў новым сезоне выступяць на ўнутранай арэне і ў міжнародных лігах. У «Цмокі-Мінск» у складзе каманды разам з Аляксандрам Кудраўцавым, Аляксеем Трасцінецкім і Аляксеем Лашкевічам будуць гуляць Дзяніс Коршук, Павел Ульянка, Аляксандр Пустагвар, а таксама некалькі замежных легіянераў. Магчымасць праявіць сябе атрымаў Роналдс Руткаўскас, сярод заяўленых — амерыканцы Скот Крыстаферсон і Джуан Сміт, плэймейкер нацыянальнай зборнай Швейцарыі Стэфан Петкавіч. Мужчынская каманда будзе змагацца на чэмпіянаце краіны, на турнірах «Еўрачэлендж» і Адзінай лігі ВТБ.

Змены адбыліся і ў жаночай камандзе, дзе кампанію «старажылам» — Вользе Ісцеляцовай, Вікторыі Панцюх, Кацярыне Урбановіч, Алесі Лаловіч складуць цэнтравая нацыянальнай зборнай Беларусі Вікторыя Гаспер, Каці Раўсберг, Аліна Іардан, Вольга Зюзькова, Яна Паневіна і Таццяна Цырулёва. Надзённай мэтай жаночай зборнай з'яўляецца паспяховае выступленне ў Балтыйскай лізе і заваяванне тытулу чэмпіёнак Беларусі.

Свае спадзяванні і ў каманды рэзерву «Цмокі-Мінск», якая прыме ўдзел у мужчынскім чэмпіянаце краіны. Трэнерам каманды стаў Тадас Сточкус.

**Алена ДРАПКО.**

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

сообщает о внесении изменений в извещение о проведении 28 сентября 2012 года 128-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска (опубликовано в газетах «Звязда» от 13.09.2012 и «Минский курьер» от 14.09.2009) третий столбец позиции 19 **дополнить словами: «Без права предоставления юридического адреса».**

**Телефон для справок 327-40-22.**
**Интернет: www.mgcn.by.**

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ



### КРЫМІНАЛ НА МЯЖЫ

Увечары на хутары каля вёскі Казнадзеюшкі Пастаўскага раёна, у паўкіламетры ад мяжы, пагранічнікі знайшлі пяць легкавых аўто: два «Мерседэсы», «Рэно», «Аўдзі» і «Фальксваген», якія кантрабандысты спрабавалі пераправіць з літоўскага боку праз «зялёную» мяжу з мэтай продажу без выплаты мытных плацяжоў. Высветлілася, што незаконны бізнэс наладзілі грамадзянін Літвы і два нашых суайчыннікі.

У момант затрымання літовец і беларус здаліся адразу, а трэці ўдзельнік крымінальнага бізнэсу паспрабаваў схавацца ад пераследу на «Фальксвагене» без нумарных знакаў. Пры гэтым ён накіраваў свой аўтамабіль на супрацоўніка пагранічнай службы і збіў яго. У выніку арганізаваных пошукавых мерапрыемстваў ужо праз паўтары гадзіны злачынец быў затрыманы ў пасёлку Лынтупы. Яго аўто на наступную раніцу знойдзена ў лесе, старанна замаскіраванае галінкамі. Увесь нелегальны транспарт канфіскаваны. Паранены пагранічнік з множнымі траўмамі дастаўлены ў ваенны шпіталь органаў памежнай службы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПАЦЯРПЕЛІ НА ВЫТВОРЧАСЦІ

Работнік мінскай аўтамыйкі атрымаў сур'ёзныя апёкі, калі закурыў у памяшканні з высокай канцэнтрацыяй пароў ацэтону.

— У выніку 28-гадовы мужчына быў шпіталізаваны з дыягназам «вялікі тэрмічны апёк галавы, рук і ног 1-4 ступеняў 25 працэнтаў паверхні цела», — расказаў **старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег МАЛЕВІЧ.** У Смаргонскім раёне траўму на вытворчасці атрымаў аператар зернесушыльнага комплексу. Апошні належыць сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву «Сінькі». 25-гадовы рабочы чысціў зернесушылку, няўдала ступіў і ўпаў унутр. Даставаць пацярпелага выратавальнікам давялося з выкарыстаннем бензарэза. Мужчыну шпіталізавалі з пераломамі ног.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАЛЯВАННЕ «ЎСЛЯПУЮ» ЗАКОНЧЫЛАСЯ ТРАГЕДЫЯЙ

У дачыненні да 30-гадовага лесніка Юркевіцкага лясніцтва Жыткавіцкага раёна аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь заведзена крымінальная справа па артыкуле аб прычыненні смерці па неасцярожнасці.

Мужчына, які мае дзяржаўнае пасведчанне на права палявання, дазвол на права захоўвання і нашэння зброі, вечарам выйшаў на паляванне ў лес. Калі пачуў шоргат, зрабіў два стрэлы з паляўнічай стрэльбы «ІЖ-58МА» 16-га калібру. Кулі трапілі ў 55-гадовага жыхара вёскі Новыя Залюцічы, які, аказваецца, паляваў побач. Мужчына памёр да прыезду медыкаў. **Афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА** расказала, што абодва грамадзяніны выйшлі на паляванне без адпаведнай ліцэнзіі і без егера.

Прынамсі, у вытворчасці Жыткавіцкага раённага аддзела СК ужо знаходзіцца крымінальная справа, якая была заведзена па аналагічным артыкуле ў дачыненні нелегальнага паляўнічага. У канцы жніўня на кукурузным полі каля вёскі Дзякавічы грамадзянін выпадкова стрэліў у свайго знаёмага. Ад ранення ў грудзі 48-гадовы мужчына сканаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже объекта недвижимости ОАО «Ивацевичдрев»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Характеристика объекта | **Капитальное строение с инв. № 100/С-1278 (служебно-бытовой корпус) площадью 4 094,3 кв.м (семиэтажное здание: фундамент свайный железобетонный, стены и перегородки кирпичные и гипсовые, железобетонные перекрытия, кровля рулонная совмещенная, год постройки 1983)** |
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. Краснознаменная, 2, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001008606, площадью 0,1282 га |
| Продавец | ОАО «Ивацевичдрев» |
| Начальная цена продажи с НДС, руб. | **24 079 200 000** |
| Сумма задатка, руб. | **2 407 920 000** |

**Организатор аукционных торгов**
**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**ПРИМЕЧАНИЕ**: Для участия в аукционе необходимо в адрес организатора аукциона подать заявление, подписать соглашение с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» и представить:
***заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка***; ***юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем*** – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; ***иностранным юридическим лицом*** – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***иностранным гражданином или лицом без гражданства*** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***представителем заявителя*** (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.
**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка 252, УНП 290433924.**
Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь и условиями, содержащимися в договоре поручения по продаже на аукционе объектов недвижимости.
**Договор купли-продажи объекта с победителем аукциона заключается Продавцом в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукционных торгов и подписания протокола о результатах аукциона.**
**Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов оплатить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона.**

**Аукцион состоится 18 октября 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.09.12 г. до 17.30 17.10.12 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56.**
**Сайт: www.bgcn.by и www.city.brest.by**

## АБЗАЦ

**За мінулую пятніцу і выхадныя дні на дарогах рэспублікі адбылося 938 ДТЗ з матэрыяльным уронам. 12 чалавек загінулі, 59 атрымалі раненні (з іх 2 дзяцей).**

У Гродне віноўнік ДТЗ з'еў пратакол. Выпадак здарыўся 16 верасня на скрыжаванні вуліц Курчатава — Горкага. 22-гадовы кіроўца «Мэрседэса» праехаў на чырвоны сігнал святлафора і сутыкнуўся з «Фальксвагенам». Пасля складання схемы ДТЗ інспектары запрасілі кіроўцаў для далейшага разгляду ў будынак ДАІ. Пасля афармлення пратакола парушальнік прачытаў дакумент. Калі даведаўся, што яго прызнаюць вінаватым у ДТЗ, ён абурыўся, схапіў дакумент са стала, скамячыў, запхнуў у рот і стаў яго есці.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



**Дакладную копію аўтамабіля Mini Cooper S змайстраваў для выстаўкі нямецкі скульптар Аляксандр Геслер. Ажурная, амаль празрыстая скульптура важыць крыху менш за 300 кг, а на яе выраб аўтару спатрэбілася 7000 самых звычайных металічных цвікоў. Каб сабраць копію аўто ў маштабе 1:1, аўтар патраціў больш за 200 гадзін, перад гэтым даволі доўга вывучаў устройства аўтамабіля, і ў выніку атрымалася арыгінальная скульптура «з металу і паветра». Стылёвая, бліскучая, падобная на кальчугу, яна выканана са звараных разам цвікоў і выклікае захапленне гледачоў і іх павагу да аўтара. Удзельнікі выставы шчыра здзіўляюцца не толькі майстэрству Геслера, але і яго мэтанакіраванасці, цярпенню і ўседлівасці.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

02 октября 2012 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Костюковичский леспромхоз».

Повестка дня:

1. О досрочном прекращении полномочий членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

2. Выборы наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Костюковичский леспромхоз».

3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Местонахождение ОАО «Костюковичский леспромхоз»: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11.

Место проведения собрания: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Бахарева, 11.

Время регистрации в день проведения собрания с 14.30 до 15.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 25.09.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

*УНП 700160680.*

# Цана памылкі, або Забіць, каб зразумець?

**«Над сэнсам і прызначэннем жыцця жанчына часцей за ўсё сур'ёзна задумваецца толькі пасля таго, як... забівае жыццё, якое носіць пад сэрцам». Гэтую думку выказала ўрач-гінеколаг жаночай кансультацыі філіяла № 1 Гомельскай гарадской цэнтральнай палiклінікі Вольга НЕСЦЕРАВА.**

Тры гады, як яна не робіць аборты. Вольга Анатольеўна спрабуе кожную цяжарную жанчыну, якая трапляе да яе, перакканаць нарадзіць дзіця. Атрымліваецца, зразумела, далёка не заўсёды. Але ж атрымліваецца. З ёй і яшчэ дзвюма валанцёркамі, якія займаюцца перадабортным кансультаваннем, мы пабывалі ў некаторых з тых жанчын, перад якімі ў свой час паўстала пытанне — нараджаць ці пазбавіцца ад дзіцяці. Яны выбралі для сваіх дзяцей жыццё, а не смерць. І расказалі — чаму. Але ж паралельна жанчыны ўзгадвалі і іншыя гісторыі, праўда, з фіналам, далёкім ад аптымізму. Параўноўвайце самі.

**ЖАННА, 22 гады. Мікіту 1 год і 8 месяцаў.**

Жанна, калі зацяжарала, была ўпэўнена, што бацька дзіцяці будзе супраць яго нараджэння.

— Урач Вольга Несцерава прапанавала: ты прымі рашэнне, і ён будзе «за». Сапраўды, ён не спужаўся. Пасля гэтага і вырашыла нараджаць. Цяпер жывём у грамадзянскім шлюбе. У той час ваганняў пагаварылі са мной псіхолагі, фільм паказалі страшны пра аборты.



Маці падтрымала мяне. Цяпер у мяне няма сумненняў, што правільна зрабіла. Гэта такое шчасце — мой маленькі Мікітка!

**НАСТАССЯ, 22 гады.**

Прыгожая, з вышэйшай адукацыяй, упэўненая ў сабе маладая жанчына год як замужам, у яе першая цяжарнасць. Але яна не хоча мець дзяцей цяпер.

— Мне трэба выплаціць крэдыт за машыну. І маці мая лічыць, што можна з дзіцем пачакаць. Вы мне будзеце расказваць, як ручкі-ножкі ў дзіцяці адрываюцца пры аборце? Не трэба, я гэта ўжо ведаю, не марнуйце час.

— Вам грошы важней, чым дзіця? — пытаецца ўрач.

— Так, — адназначна заяўляе жанчына.

— Мы спрабавалі адгаварыць яе ад аборту ўсёй кансультацыяй, але не змаглі, — з горыччу расказвае Вольга Несцерава. — А ніхто ж не ведае, што будзе праз некалькі гадоў. Магчыма, потым гэтая жанчына пагодзіцца аддаць усе грошы, каб толькі зацяжарыць.

**ТАЦЦЯНА, 55 гадоў.**

Першую цяжарнасць перарвала, калі была студэнткай медыцынскага інстытута. Палічыла, што яшчэ рана, хоць будучы муж быў не супраць дзіцяці. Потым нарадзілася дачка. Наступная цяжарнасць была нечаканай, хоць быццам бы на той момант дыпламаваны ўрач павінна была ведаць, адкуль дзеці бяруцца. Паколькі ў жыццёвых планах другому дзіцяці не было месца (пакуль!), пайшла на аборт. У жыццёвых планах не было месца і аўтамабільнай аварыі, але... у ёй загінуў муж Таццяны. Больш яна сям'і не стварыла. Цяпер дарослая дачка, з якой не заладзіліся ўзаемаадносіны, пакінула маці. Жыве ў іншым горадзе і не імкнецца да цесных стасункаў.

**МАРЫЯ, 25 гадоў. Ангеліне 7 месяцаў.**

Яшчэ карміла грудзямі першую дачку, калі зацяжарала другім дзіцем. Старэйшая дзяўчынка была «складанай», муж пастаянна ў камандзіроўках. І маладая жанчына засумнявалася...

— Але ж калі я прыйшла на кансультацыю, Вольга Анатольеўна сказала: мае такія ж выраслі, і вашы вырастуць. Усе блізкія мяне падтрымалі. Асабліва сястра. У яе няма дзяцей. Яна мне кажа: будзем хаця б тваіх выхоўваць разам.

**ГАЛІНА, 47 гадоў.**

У 20 гадоў зрабіла аборт пасля таго, як ад яе адмовіўся той, хто мог бы назвацца бацькам ненароджанага дзіцяці. Праз некалькі гадоў выйшла замуж і хутка зацяжарала. Аднак арганізм выкідаў плод. І так здаралася 8 разоў. Дзявятую цяжарнасць, каб захаваць дзіця, праляжала пад кропельніцамі ў бальніцы. Цяпер адзінаму сыну 10 гадоў. Спадзяецца, што паспее пагуляць на яго вяселлі, хоць пасля перанесеных выкідышаў здароўе, на жаль, моцна падводзіць.

**НАТАЛЛЯ, 26 гадоў. Дачцэ Вікторыі 1,5 года.**

Жыве з мужам у грамадзянскім шлюбе. Выхоўвае дачку ад першага шлюбу і вось цяпер — маленькую сур'ёзную Вікторыю Віктараўну. У Наталлі была перарваная цяжарнасць. Маці маладой жанчыны настаяла, каб урачы знайшлі сацыяльныя паказанні для аборту. І ёй на вялікім тэрміне зрабілі штучныя роды. Пасля быў выкідыш. Калі прыйшла з думкай пра аборт да доктара наступны раз, пачула: няма гарантыі, што потым зноў зможаш нарадзіць.

— Мы на той момант не ведалі, дзе нават жыць будзем. А тут яшчэ вестка пра магчымае дзіця... Я яго хацела, а муж казаў: пакуль рана, жыць няма дзе... Я кажу: усё разумею, але ж у дзіцяці сэрцайка ўжо б'ецца. Потым сказала: маўляў, урач не дае шанцаў, што дзеці яшчэ будуць, калі зраблю аборт. Ён падумаў і гаворыць — пакідай. Да таго, як Віка з'явілася на свет, ён мне казаў: ты думаеш, я з ёй цацкацца буду? А цяпер сам да яе ноччу ўскоквае першым. Муж ездзіць працаваць у Піцер, на жыццё хапае, хоць і жывём на здымнай кватэры. Гэта спачатку здаецца — усяго столькі спатрэбіцца! Але ж калі дзіця нараджаецца, усе праблемы, у тым ліку матэрыяльныя, вырашаюцца неяк аўтаматычна.

— У мяне быў іншы аналагічны выпадак, — уздыхае ўрач Вольга Анатольеўна. — Тады я так не сказала жанчыне катэгарычна пра тое, што дзяцей можа больш не быць. Шкадую вельмі, бо менавіта так і здарылася...

**МАРЫНА, 42 гады.**

Аборт зрабіла ў 25, бо сувязь, у выніку якой зацяжарала, палічыла выпадковай. Нават не папыталася ў магчымага бацькі дазволу, бо была абсалютна перакканана ў правільнасці свайго рашэння. На аперацыю яе адвёў іншы мужчына, які быў упэўнены, што стане для яе каменнай сцяной. Але ад яго яна збегла да будучага мужа. Аднак пасля доўгіх абследаванняў высветлілася, што яе абраннік не можа мець дзяцей. Сяброўкі і нават свякроў рэкамендавалі схадзіць «налева», каб паспрабаваць зацяжарыць. Не пайшла. Праблему «вырашыў» муж: пайшоў да іншай жанчыны расціць дваіх яе дзяцей.

**АЛЕНА, 36 гадоў. Глебу 5 месяцаў.**

Яны з мужам 6 гадоў чакалі нараджэння першынца. Услед за Дзімам праз паўтара года нарадзілася Надзея. Калі Алена даведалася пра трэцюю цяжарнасць (яшчэ карміла грудзямі другое дзіця), крыху разгубілася — ужо занадта невялікая розніца паміж дзецьмі атрымліваецца.

— Першая думка была — мы не справімся, не зможам. Жыццё такое, што прымусіла сумнявацца. І тут мяне накіравалі на кансультацыю. Пасля яе мы вырашылі, што будзем нараджаць. Дарэчы, я і так ведала, што пакіну дзіця, але ж у мужу крыху сумнявалася. Ён спачатку казаў: куды нам трэці, а потым перадумаў, і цяпер мы не шкадуем, што іх трое. Глядзіце, які Глеб прыгожанькі! Вядома, за дзецьмі догляд пільны павінны быць. Але ж я ў свой час даглядала свёкра, інваліда-калясачніка. І сваю маці таксама даглядала. Дзяцей даглядаць не складаней. Калі Бог даў, значыць, так і трэба. Прыйдзе час, і яны мне дапамогуць.

**ЛІЛІЯ, 33 гады.**

Замужняя жанчына, каб нарэшце зацяжарыць, зрабіла штучнае апладненне і ўжо чакала з'яўлення на свет дзвюх дзяўчынак. Пры ультрагукавым даследаванні высветлілася, што ў адной з іх няма рукі ад локця. Паехала ў Санкт-Пецярбург на рэдукцыю (выдаленне) хворага эмбрыёна. Пасля першай аперацыі ў жанчыны пачаўся сэпсіс. Пры другой выдалілі тое дзіця, якое было здаровым, а потым і ўсе дзетародныя органы. Гавораць, цуд, што сама засталася жывой. Хаця гомельскія ўрачы пераконвалі яе нараджаць.

**ВАЛЯНЦІНА, 36 гадоў. Крысціне хутка споўніцца год.**

У Валянціны 5 сыноў. На шостай цяжарнасці сужэнцы рашылі, што хопіць. І жанчына зрабіла аборт, ад якога ўрач, як магла, яе адгаворвала. Пасля былі душэўныя пакуты па ненароджаным немаўляці. Менавіта яны паўплывалі на з'яўленне на свет Крысціны, якой Валянціна зацяжарала праз некаторы час. Дзяўчынцы неўзабаве год. Вакол яе 5 братоў-абаронцаў, старэйшаму з якіх 15. І кожны рады дапамагчы маці.

— Дзяўчынку я даўно хацела. Дарэчы, муж мой спачатку не хацеў пра шостага і чуць. А потым пахадзіў, падумаў, і гаворыць: «Давай пакінем — а раптам дзяўчынка?». Зараз вельмі задаволеныя. Многія бытавых цяжкасцяў баяцца. Гэта так, калі галоўная мэта — грошы, багацце... Мне казалі — а навошта вы столькі нараджалі, пра што вы думалі?



Глядзяць, як на дзівачку. А я ж нічога ні да каго не хаджу прасіць. Мы і карову трымаем, і свіней, і курэй бройлерных лета кормім. І зіму з мясам заўсёды — не галадаем. Канешне, калі б гаспадарку сваю не трымалі, агарод не сеялі, было б складана. А так — разам справімся!

**КАЦЯРЫНА, 39 гадоў.**

Два яе старэйшыя сыны заканчваюць школу. Муж пайшоў да іншай, нечакана пакінуўшы апошні «падарунак» — дзіця пад сэрцам. Вагалася доўга, тым больш што заўсёды марыла пра дачку. Але ж адважыцца на аборт аказалася лягчэй, чым даць жыццё дзіцяці. Нават пры наяўнасці ўсяго таго, што завецца матэрыяльнай забяспечанасцю. Муж быў гатовы ўжо і назад вярнуцца, але ж калі даведаўся пра самастойнае рашэнне Кацярыны, перадумаў. Цяпер яна ў думках пастаянна адзначае верагодны дзень нараджэння магчымай дачкі.

**НІНА, 41 год. Аляксандру 1 месяц.**

Сям'я, у якой трое дарослых дзяцей, нядаўна пераехала жыць у прыгарад Гомеля з Хойніцкага раёна. Не паспелі асвоіцца на новым месцы, а тут — такі падарунак лёсу. Ды і ўзрост маці не той, каб з дзіцем цацкацца. Затое цяпер для Сашы ў доме не толькі адведзены асобны пакойчык, але і створаны сапраўдны дзіцячы «палац» — ложачак у зялёным колеры.

— Складана адважыцца на чацвёртае дзіця. Мы не планавалі, так здарылася. Думалі, як быць? Навокал усе казалі — навошта гэта вам? Дзеці вялікія, магла б ужо і спаць ноччу, а не да немаўляці падымацца... Блізкія мяне ўсё ж падтрымалі. Кажуць — будзе «лялька» пад старасць. Будзе каму вас весяліць, калі старэйшыя дзеці раз'едуцца. Цяпер мы вельмі рады, што Саша ў нас з'явіўся. Я ўдзячная Вользе Анатольеўне, якая мяне падтрымала. Яна кажа: і ў старэйшым узросце нараджаюць! На працягу тыдня прыняла рашэнне і больш не сумнявалася. Роды прайшлі паспяхова. Складанасцяў, зразумела, дабавілася. Адказнасці больш, чым з папярэднімі дзецьмі. Старэйшыя дочкі добра ўспрынялі з'яўленне маленькага. Сын спачатку казаў, што не будзе катаць каляску. А цяпер усе без выключэння хочуць патрымаць немаўля на руках, прыходзяць, назіраюць, як ён усміхаецца ў сне. Бацька ноччу падыходзіць да сына. Ён, праўда, хацеў дзяўчынку, але цяпер шчаслівы і з хлопчыкам.

**ВОЛЬГА, 37 гадоў.**

Па маладосці зрабіла некалькі вакуум-абортаў, а потым, калі выйшла замуж, сутыкнулася з праблемай зацяжарыць. Толькі штучнае апладненне прынесла доўгачаканы вынік: дзіця сёлета пайшло ў першы клас. Кажа, што тыя, хто з гэтай праблемай сутыкнуўся, ведаюць сапраўдную цану шчасця быць матуляй. Сёння Вольга сама спрабуе адгаворваць жанчын ад аборту.

**АЛЕНА, 37 гадоў. Аляксею 10 месяцаў.**

Яе Алёша быццам з абгорткі часопіса — сядзіць на покуці пад абразамі і шчодра адорвае ўсіх усмешкай. У галаву прыходзіць фантастычная ідэя: вось бы жанчынам у сумненнях загадзя паказваць такі фотаздымак — якім ён будзе, калі народзіцца! Старэйшыя дзеці Алены амаль дарослыя, хутка школу закончаць:

— Мы пабойваліся спачатку. Муж казаў: не пракормім. Ды яшчэ мая цяжарнасць якраз на крызіс прыпала — як пачало ўсё даражэць! Хоць у нас свой дом і месца ўсім хапае. Два дні муж маўчаў, а потым я зразумела, што ён не супраць. У радзільні шапталіся: пойдзем паглядзім на тую «хворую», што трэцяе дзіця нарадзіла! Што з іх возьмеш — яны яшчэ маладыя... З на-



раджэннем Аляксея стымул у жыцці з'явіўся. Хочацца жыць, працаваць — ёсць дзеля каго. За адну ўсмешку ўсё можна аддаць.

**ВЕРА, 69 гадоў.**

З мужам, які піў, яна жыла, як кошка з сабакам, таму чаргавала аборты з нараджэннямі сыноў. Сама іх, дваіх, выгадавала, дала адукацыю, чакала, што ажэняцца, і дом напоўніцца галасамі ўнукаў. Лёс распарадзіўся інакш. У 90-я аднаго забілі ў п'янай бойцы, другі праз паўгода патануў. Цяпер яна ходзіць на могілкі і расказвае ім — тым хто пакінуў заўчасна гэты свет, пра ненароджаных, якія маглі б суцешыць яе ў старасці.

...Відаць, і многія ведаюць падобныя гісторыі. Пакуль пакідаю іх без каментарыяў. Які бок шаляў пераважыць у лёсавызначальны момант жыцця жанчыны, залежыць ад многіх акалічнасцяў. Пра тайныя матывы, прычыны і падставы, якімі кіруюцца будучыя матулі, пры пошуку адказу на амаль што гамлетаўскае пытанне (быць ці не быць новаму жыццю?) пагаворым наступным разам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## ЯК РЭКЕЦІРЫ ВАЛЮТНАГА МІЛЬЯНЕРА ДАГАНЯЛІ

**Гэтая крымінальная гісторыя насамрэч можа стаць нагодай для напісання сцэнарыя: зладзеі паспрабавалі адабраць больш за 1 мільён 890 тысяч долараў і каля 320 тысяч еўра ў падпольнага валютнага мільянера. Апошні, дарэчы, паспрабаваў правесці гэтыя грошы з Украіны ў Маскву праз Беларусь. Але пра гэта стала вядома рэкецірам (усе яны — грамадзяне Расіі). У выніку вялікая колькасць валюты папоўніла бюджэт Беларусі.**

— Адзін з трох зладзеяў, якія паспрабавалі на тэрыторыі Беларусі завалодаць вялізнай сумай валюты, спецыяліст па алмазным бурэнні. Яму і яшчэ двум расіянам стала вядома, што багаты чалавек вязе ў Маскву вялікую колькасць валюты. Адкуль у яго такое багацце — справа іншая. На сваім аўто зламыснікі «падселі на хвост» аўтамабіля патэнцыяльнай ахвяры яшчэ на тэрыторыі Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці, — расказвае **Іван КАРАЛЁЎ, пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці.** — Пры сабе яны мелі цэлы арсенал зброі: пісталет «ТТ», выраблены ў 1930-я гады, нож, металічную дубінку і гэтак далей.

На хуткасці каля 200 кіламетраў у гадзіну машыны перавозчыка валюты і рэкеціраў літаральна «ўляцелі» ў Аршанскі раён. Падчас язды аўто сутыкнуўся, два зламыснікі загінулі.

Яшчэ падчас пагоні пацярпелы патэлефанаваў у міліцыю. На месцы аварыі міліцыянеры і знайшлі ў тайніку аўто валюту.

Па прыгаворы суда адзін са зламыснікаў, які застаўся ў жывых, быў пазбаўлены волі тэрмінам на 8 гадоў 6 месяцаў з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму і канфіскацыяй маёмасці. Незаконную валюту таксама канфіскавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Гарэў цэх, гарэла мэбля

**У Наваполацку па вуліцы Армейскай раніцай гарэў цэх па вытворчасці мэблі. Мяркуецца, што прычынай пажару стала пакінутая без нагляду на электрапліце гаручая вадкасць.**

Калі на месца прыбылі падраздзяленні пажарных-выратавальнікаў, гарэла ўжо на плошчы 200 квадратных метраў. Цэх размешчаны ў аднапавярховым будынку, які стаіць асобна. Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, на момант узнікнення пажару ў памяшканні знаходзілася 15 чалавек. Яны пакінулі цэх самастойна яшчэ да прыбыцця падраздзяленняў МНС. Пацярпелых не было. У памяшканні агонь знішчыў мэблю, яе складаныя часткі. Значную частку маёмасці выратавалі пажарныя. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала пакінутая без нагляду на электрапліце гаручая вадкасць на аснове бітуму і шкіпінару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нерудпром» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже**

**корпуса промывки (здание специализированное иного назначения инв. № 600/С-59848), об. пл. 2211,7 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Минский р-н, севернее д. Захаричи.**

**Начальная цена с НДС – 590 700 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,2241 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).**

Объект обременен договором аренды. **Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.09.2012.*

Аукцион состоится **27.09.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**



**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**28 сентября 2012 года повторно проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе**

| | | Лот 1 | Лот 2 |
|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, г. Заславль, пер. Рогнеды, 17 | Минский район, г. Заславль, пер. Рогнеды, 18 |
| 2 | Кадастровый номер | 623650100001004110 | 623650100001004107 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1500 га | 0,1499 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 70 | 70 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 6 | Инженерная инфраструктура * | электричество | электричество |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 531 180 | 531 180 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 13 867,35 доллара США | 13 876,60 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 23 000 000 | 23 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д. 8. Дата проведения: **28.09.2012 г. в 10.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 24.09.2012 г. в 17.00. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в аренду единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

* В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА ОТ 18.09.2012**

**Сведения о застройщике:** Совместное общество с ограниченной ответственностью «Лада ОМС-Инжениринг» (СООО «Лада ОМС-Инжениринг»). СООО «Лада ОМС-Инжениринг» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС-Холдинг» ЗАО.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

**Режим работы:** рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 19.00, суббота с 09.00 до 15.00; выходной день – воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191118730.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 на ул. Грушевской в г. Минске;

2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 на ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;

3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 на ул. Щорса;

4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 на 3-й ул. Щорса.

**Цель проекта** – строительство объекта «Комплекс многоэтажных жилых домов с объектами общественного назначения на территории в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой со сносом существующей усадебной жилой застройки в границах ул. Маяковского, ул. Аранской, ул. Денисовской, р. Свислочь и выделением 1-ой очереди многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения. Жилой дом № 5 по генплану» (1-й пусковой этап) с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации:**

Начало строительства – май 2011 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – июль 2013 г.

У Застройщика имеются:

- решение Мингорисполкома о разрешении строительства от 24.03.2011 № 731;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 04.10.2010 № 1085-15/10).

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, территория в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства.**

По жилому дому:

- 1-комнатные – 4 шт.
- 2-комнатные – 12 шт.
- 3-комнатные – 12 шт.

**Цена одного квадратного метра** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет:

- 1-комнатные квартиры – 11 800 000 белорусских рублей;
- 2-комнатные квартиры – 11 200 000 белорусских рублей;
- 3-комнатные квартиры – 11 000 000 белорусских рублей.

**Данные о правах застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен застройщику решением Мингорисполкома от 24.03.2011 № 731 площадью 0,3737 га.

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию –** июль 2013 г.

**Сведения о договорах строительного подряда:**

договор подряда с СООО «Гранитстройинвест» от 28.03.2011 № 28-03/1.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**

тел.: 8-017-220-40-43, VELCOM 8-029-699-40-93, 8-029-699-40-32; на сайте http://www.lada-park.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

**Публикация:**

Проектная декларация опубликована в газете «Звязда» от 18.09.2012 г.



Утерянные документы на имя **ПИЩ Раисы Григорьевны** (Свидетельство № 51428, УНП 290424255) прошу **считать недействительными.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ**
**Аукцион состоится 25 октября 2012 г. в 11.20 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел.: 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Белорусское РУСП «Белгосстрах», тел. 8(0222)311965, 8(02243)31939; по лотам №№ 2 и 3 – РУП «Дорводоканал», тел. 8(0222)393561; по лоту № 4 – РУП «Могилевское отделение Белорусской железной дороги», тел. 8(0222)392665.

Аукцион проводится в соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности» и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **23 октября 2012 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **25 октября 2012 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о недвижимом имуществе: Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Информация о земельных участках: Площадь, га | Срок аренды, лет | Размер задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание гаража одноэтажное, кирпичное, 30,9 кв.м | Могилевская обл., г.п. Краснополье, ул. Первомайская | 22 098,488 | 0,0040 | 25 | 4 000,0 |
| 2 | Водонапорная башня одноэтажная кирпичная, 34,8 кв.м | Могилевская обл., г. Быхов, ст. Быхов | 19 527,533 | 0,0141 | 10 | 3 000,0 |
| 3 | Здание насосной станции с пристройкой одноэтажное, кирпичное, 95,8 кв.м | Могилевская обл., г. Быхов, ул. Вильня | 22 322,476 | 0,1598 | 10 | 4 000,0 |
| 4 | Здание нежилое с тамбуром и тремя крыльцами, одноэтажное, кирпичное, 275,5 кв.м | Могилевская обл., Быховский р-н, Борколабовский сельсовет, о.п. Борколабово, 1 | 15 283,224 | 0,1593 | 40 | 3 000,0 |

Начальная цена недвижимого имущества лотов № 2 и № 3 понижена на 20 процентов, лота № 4 – на 80 процентов.

Земельные участки предоставляются победителям (единственным участникам) аукциона в аренду без взимания платы за право заключения договора аренды.

Условия для победителя (единственного участника) аукциона в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания недвижимого имущества:

лота № 1: получить в установленном законодательством порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект в случае изменения целевого назначения земельного участка;

лота № 4 – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается **заявление** на участие в аукционе с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия в установленном порядке из Устава либо иного учредительного документа.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Допускается участие в аукционе на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более субъектов малого предпринимательства – индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций (далее – консолидированные участники).

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов от консолидированных участников уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона на аукцион приравнивается к письменному отзыву заявления на участие в нем.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка (по лоту № 4), а по лотам №№ 1, 2 и 3 – в течение 10 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола), обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, на счета получателей, указанные в протоколе аукциона.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат. При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации в соответствии с законодательством.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества. Покупателю по его письменному заявлению может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества с ежемесячной индексацией платежей.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.

# АДДАЦЬ НЕРУХОМАСЦЬ У ДОБРЫЯ РУКІ

**Сёлета завяршаецца праца па прыцягненні ў гаспадарчы абарот будынкаў, якія не выкарыстоўваліся. У Магілёўскай вобласці падводзяць прамежкавыя вынікі ў гэтай сферы.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



## СПАДЧЫНА І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

Навядзенне парадку на зямлі — гэта шырокае паняцце. Адным з яго важных складнікаў з'яўляецца праца з закінутымі будынкамі. Большасць трэба вяртаць да жыцця і працы, некаторыя ліквідаваць. І справа не толькі ў тым, што яны псуюць выгляд паселішчаў. Размова ідзе пра эканоміку, эфектыўнае выкарыстанне ўласнасці.

У фондзе «Магілёўаблмаёмасць» тлумачаць, што безгаспадарныя будынкі — гэта савецкая спадчына. З разбурэннем СССР парушыліся сувязі, уласнікі згубіліся на постсавецкіх прасторах, маладыя краіны мелі новыя планы. Аднак дайшла справа і да гэтай нерухомасці.

Паводле даручэння Прэзідэнта, праца па прыцягненні ў абарот нерухомасці, якая не выкарыстоўваецца, вядзецца ад 2007 года, і сёлета павінна быць завершана.

— За 2007-2011 гады ў Магілёўскай вобласці ўдалося скараціць колькасць аб'ектаў, што не выкарыстоўвацца, амаль на 5 тысяч, у тым ліку прададзена амаль 1200, — паведаміў **дырэктар фонду «Магілёўаблмаёмасць» Алег МЯКІНЬКІ.** — Новыя ўласнікі выдаткавалі на іх аднаўленне і арганізацыю вытворчасці больш за 40 мільярдаў рублёў і стварылі больш за тысячу новых працоўных месцаў. Поспехі ёсць, але да пераможных справаздач яшчэ працаваць і працаваць.

Сёлета «прагучыць» фінальны акорд працы (у гадавым плане — больш за 600 аб'ектаў). За 8 месяцаў з'явіліся гаспадары больш чым у паловы. Будынкі не толькі прадаюцца, здаюцца ў арэнду, перадаюцца бясплатна ў некаторых выпадках, але і ліквідуюцца як трухлявыя і аварыйныя, і колькасць такіх перавысіла паўтары сотні.

— На рынку нерухомасці найбольшая актыўнасць назіраецца якраз напрыканцы года, — аптымістычна каментуе сёлетнія планы Алег Мякінькі. — Зроблена ўжо вельмі шмат, і галоўнае, што гэта прынесла карысць эканоміцы вобласці і краіны.

Між тым, кіраўніцтва Магілёўскай вобласці даручыла фонду працаваць з любымі безгаспадарнымі аб'ектамі на тэрыторыі рэгіёна, уключаючы маёмасць сельскіх гаспадарак і спажывецкай кааперацыі, якая не выкарыстоўваецца. «Незалежна ад таго, каму належыць маёмасць, яе трэба эфектыўна выкарыстоўваць», — так лічыць **старшыня аблвыканкама Пётр РУДНІК**.

## ВЯРТАННЕ Ў СТРОЙ

Дырэктар «Магілёўаблмаёмасці» звяртае ўвагу на продаж аб'ектаў за адну базавую велічыню. Гэты спосаб прыцягнення ў гаспадарчы абарот аб'ектаў шырока ўжываўся ў Магілёўскай вобласці.

— Гэта нестандартны падыход, — пагаджаецца Алег Мякінькі. — Раней сума была 35 тысяч, цяпер — 100 тысяч рублёў. Але шмат аб'ектаў знаходзілася не ў самых прывабных месцах, ды і ў непрыдатным стане. Да новых гаспадароў вылучалася толькі адно патрабаванне — стварыць новыя працоўныя месцы. Такім чынам мы стварылі добрыя ўмовы для прадпрымальнікаў, якія не маюць вялікага стартавага капіталу, але маюць бізнэс-ідэю, якую імкнуцца рэалізаваць.

За пяць гадоў за такія сімвалічныя грошы прадалі амаль 750 аб'ектаў, і сёлета іх таксама было шмат. Знакавы аб'ект — былая база сельгасхіміі ў Крычаве. Там былі паўразбураны адміністрацыйны будынак, склады для захоўвання мінеральных угнаенняў і гаражы, а цяпер з'явілася вытворчасць па пляценні вяровак і канатаў. Прычым выкарыстоўваецца для гэтага мясцовая сыравіна: ніткі з «Магілёўхімвалакна» і адходы льнозаводаў вобласці.

Кошт любога аб'екта вызначаюць спецыялісты, а далей — гэта пытанне попыту і прапановы. Адна справа — прадаваць будынак у абласным цэнтры, і іншая — у сельскай глыбінцы. Аднак аб'екты рэалізуюцца «больш ці менш» ва ўсіх сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці. Сродкі паступаюць у бюджэт.

Напрыклад, летась былы Дом культуры завода штучнага валакна ў Магілёве нарэшце прадалі. Стары будынак у «сталінскім стылі» шмат часу стаяў у запусценні і разбураўся. Аднак летась ДК перайшоў у новыя рукі да фірмы з добрай рэпутацыяй, якая на працягу трох гадоў зробіць там рэканструкцыю і адкрые культурна-забаўляльны цэнтр. Пакупніку будынак каштаваў 1,5 мільярда рублёў.

А нядаўна прыватнікі за 1,3 мільярда рублёў набылі тое, што засталося ад базы адпачынку ў вёсцы Чачэвічы — курортным месцы ў Быхаўскім раёне, на беразе вадасховішча. Мясцовыя жыхары ўзгадвалі з настальгіяй, што калісьці гэтая база «кармі-ла» ў Чачэвічах многіх — дэфіцытнымі працоўнымі месцамі і заробкамі. Можа, добрыя часіны вернуцца?

## НОВАЕ ЖЫЦЦЁ СТАРЫХ БУДЫНКАЎ

Добрых прыкладаў вельмі шмат: былы будынак Шклоўскай сельгастэхнікі аддалі прыватнаму арматурна-ізалятарнаму прадпрыемству, якое пашырыць вытворчасць. У Глускім раёне знайшлі будынак пад арганізацыю швейнай вытворчасці: глыбінцы вельмі патрэбны новыя працоўныя месцы, асабліва для жанчын. У Дрыбіне таксама збіраюцца шыць (і нават дзіцячае адзенне), і пад гэта таксама ёсць будынак, які раней не выкарыстоўваўся.

У аграгарадку Баркалабава Быхаўскага раёна на базе былой калгаснай сталовай ужо адкрылася «Салодкая сядзіба». У Слаўгарадзе будынак у некалькі паверхаў за 4 мільёны рублёў выкупіла гаспадарка. У адной з вёсак Бабруйскага раёна будынак, які калісьці належаў калгасу, набыла расійская фірма: кошт стартаваў ад базавай велічыні і дайшоў да 76 мільёнаў рублёў.

У Магілёве можна праводзіць спецыяльную экскурсію па аб'ектах, якія калісьці былі закінутымі і малапрывабнымі, а сталі цудоўнымі месцамі адпачынку. Напрыклад, у самым цэнтры можна паказаць «Карчму на Шклоўскім базары»: раней гэта быў падвал, а цяпер папулярная кавярня ў народным стылі.

У былой мэблевай краме ў адным з мікрараёнаў абласнога цэнтра адкрыўся новы сучасны гандлёвы пункт: па харчовыя тавары сюды ездзіць паўгорада.

Модны фітнэс-клуб, дзе набываюць форму і зараджаюцца аптымізмам стомленыя ад вечнай мітусні гараджане, месціцца таксама ў былым безгаспадарным будынку. Праўда, цяпер паверыць, што ён калісьці быў нікому не патрэбным, вельмі цяжка: рамонт, камфорт, гламур.

Стары кінатэатр на ўскраіне ператварыўся ў царкву. З гаража атрымалася вытворчае памяшканне. З ваенных складоў — аўтасэрвіс. З падвалу — сучасная крама.

— Можна ўбачыць: што было, і што стала, — кажа **начальнік упраўлення ўласнасці Магілёўскага аблвыканкама Ганна ЦУМЕРАВА**. — У кожнага будынка свая гісторыя, свой лёс, і кожны дарагі нам па-свойму. Але агульны вынік ёсць, ён адлюстраваўся ў аблічы абласнога цэнтра.

## КАМУ ПЛОШЧЫ ПАД ОФІС?

— У бліжэйшыя месяцы праца будзе працягнута, — кажа Алег Мякінькі. — Скажу толькі, што за верасень у вобласці плануем прадаць з аўкцыёнаў 53 аб'екты.

Ганна Цумерава паказвае графікі, паводле якіх у Магілёве завяршаецца работа з маёмасцю, якая не выкарыстоўвалася: уключаючы спосабы, тэрміны і персанальна адказных за справу. Кантроль за выкананнем — штотыдзень.

Сёлета гарадскому ўпраўленню ўласнасці трэба было разабрацца з 33 аб'ектамі, і з двума дзясяткамі ўсё ўжо вырашана.

— Напрыклад, у горада Магілёва ёсць уласнасць у Бабруйскім раёне — былы піянерскі лагер: ім цікавяцца, тым больш што такія аб'екты прадаюцца па галандскім метадзе, з паніжэннем пачатковага кошту, — расказвае Ганна Трафімаўна і паказвае здымкі ў спецыяльным буклеце для дзелавых людзей, патэнцыйных пакупнікоў. — У Магілёўскім раёне ў нас было некалькі былых ФАПаў, якія мы рэалізавалі, і цяпер застаўся на продаж яшчэ адзін.

Пакуль не ўдаецца прадаць чатыры будынкі, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і таму каштуюць дорага, а аднаўляць іх будзе яшчэ даражэй. Два з іх месцяцца ў былым ваенным гарадку, дзе мяркуецца ўзвесці ў будучыні сучасны мікрараён — яны ўжо 6 гадоў выстаўляюцца на продаж, але пакуль безвынікова.

— Аднак горад усё бліжэй падступае да забудовы тэрыторыі, і гэта добрая перспектыва, — лічыць Ганна Цумерава. — Адзін будынак давялося забраць у новых уласнікаў і вярнуць у гарадскую маёмасць, бо ён быў у «ахавым» стане: стары жылы дом каля Дняпра, гісторыка-культурная каштоўнасць стаіць без вокнаў і дзвярэй. Будзем шукаць новага, больш дбайнага гаспадара. А чацвёрты аб'ект — гэта былы медвыцвярэзнік на вуліцы Лазарэнкі.

Дамы на гэтай самай вуліцы Лазарэнкі — прадмет абмеркавання ў Магілёве з тых самых часоў, як там зрабілі новую аўтатрасу, а старыя будынкі засталіся недзе ўнізе і паступова набылі неахайны выгляд. Магілёўцам хацелася б, каб усё было прыгожа, аднак гэта атрымліваецца не адразу.

— З двума дамамі з гэтай тройцы ўжо вызначыліся, — паведамляе кіраўнік упраўлення ўласнасці. — Пасля рэканструкцыі ў адным з іх будзе цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм. А другі мы прадалі летась магілёўскай будаўнічай фірме, якая адкрые там шматфункцыянальны цэнтр дзелавога прызначэння. Офісныя плошчы ў цэнтры Магілёва цяпер вельмі запатрабаваны.

## ЛІСТ У ФЛАРЫДУ

Увогуле прыцягнуты ў гаспадарчы абарот 279 будынкаў уласнасці горада Магілёва — іх прадалі, здалі ў арэнду, перапрафілявалі і гэтак далей. За продаж і ўвогуле выкарыстанне маёмасці з 2007 года бюджэт атрымаў каля 70 мільярдаў рублёў. Іншае пытанне — што і калі робяць у гэтых аб'ектах, і гарадскія ўлады аналізуюць сітуацыю.

— Летась намі абследаваны ўсе аб'екты, якія былі прададзены ў Магілёве за апошнія два дзясяткі гадоў, — расказала Ганна Трафімаўна. — Нават калі там тройчы памяняўся ўласнік, мы адсочваем іх лёс. Менавіта такім чынам дамагліся таго, што шмат будынкаў на пешаходнай вуліцы Ленінскай у цэнтры, якія ўласнікі закансервавалі, сталі аднаўляць.

Ва ўпраўленні ўласнасці расшукваюць уласнікаў магілёўскіх дамоў нават у Фларыдзе: давялося пісаць ліст у Маямі і настойліва прасіць навесці парадак з уласнасцю ў Магілёве. Увогуле Цумерава кажа, што продаж нерухомасці — гэта латарэя, і цяжка дакладна прадказаць яго будучыню.

Так, напрыклад, адбылося з былым Домам быту ў самым цэнтры Магілёва. Гэты ўжо патрапаны першымі рамонтнымі работамі будынак, які цяпер стаіць з пабітымі вокнамі і часткова зацягнуты будаўнічай сеткай, сваім выглядам мазоліць вочы.

— Яго прадалі на аўкцыёне з умовай поўнай рэканструкцыі і вяртання прадпрымальнікаў, якія займаюцца бытавымі паслугамі, у будынак, — каментуе начальнік упраўлення ўласнасці. — Летась работы пачаліся, але інвестыцыйна-будаўнічая кампанія стала зведваць складанасці ў сувязі з крызісам. Мы звярталіся ў суд, каб сумеснае прадпрыемства прымусілі выконваць умовы продажу. Але сітуацыя не памянялася, і пракуратура Ленінскага раёна Магілёва была вымушана звярнуцца ў суд для абароны інтарэсаў дзяржавы. Суд прыняў рашэнне аб вяртанні будынка ва ўласнасць горада, але яно яшчэ можа быць абскарджана, таму мы пакуль у чаканні канчатковага выніку.

